# Весці

## БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДАГАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА


## № 3 (17) 1998

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.



*Галоўны рэдактар:*
Л. Н. Ціханаў

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
Г. А. Баўтута
В. А. Бондар (*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
А. А. Грымаць
Т. А. Грыгор'ева
І. І. Казімірская
Я. Л. Каламінскі
Л. А. Кандыбовіч
Г. А. Космач
Т. Е. Лемешава (*адказны сакратар*)
М. І. Мішчанчук
І. А. Новік
М. М. Плескацэвіч (*нам. галоўнага рэдактара*)
А. У. Рагуля
М. Т. Стэльмашук
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. С. Яўневіч


ЗМЕСТ


**Педагогіка**

*Вадзінскі Д. І.* Прынцыпы модульнага навучання ........ 5

*Сілівон В. А., Тарусава Я. Г.* Сучасныя тэндэнцыі ў тэхналогіі навучання маляванню дашкольнікаў ........ 9

*Кравец А. У.* Тэсціраванне ў працэсе фарміравання ў вучняў матэматычных паняццяў ........ 15

*Лісава М. І.* Падрыхтоўка будучых настаўнікаў да развіццёвага навучання матэматыцы ... 20

*Гарэлік І. В.* Параўнальны аналіз рашэння задач па механіцы студэнтамі-фізікамі I і IV курсаў ... 24

*Апостал Н. А.* Камп'ютэры ў вучэбным працэсе. 28

*Обух Р. Г.* Аспекты ўзаемасувязі: школьная геаграфічная адукацыя і падрыхтоўка будучых настаўнікаў геаграфіі ........ 34

**Псіхалогія**

*Бакуновіч М. Ф.* Да пытання даследавання мэт. 40

**Мовазнаўства**

*Курбека А. В.* Сэнсавая сувязь рэплік дыялогаў у празаічных творах Івана Мележа ........ 44

*Ржавуцкая М. С.* Лексіка-граматычныя перакладчыцкія трансфармацыі ў структуры простага сказа ........ 49

*Саўко У. П.* Праблема ўзбагачэння слоўніка школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы..... 54

*Катоўская С. С.* Прасадычныя асаблівасці камунікатыўных разнавіднасцяў нямецкіх рытарычных пытанняў........ 58

*Кураш С. Б.* К вопросу о разграничении терминов «сложная метафора» и «развернутая метафора» ........ 64



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

АКЛ

*activity. The gaals are the dissemination of national-socialism's ideal among the belorussian youth.*

УДК 281

*А. М. Сурта*

# Сацыяльна-палітычныя адносіны ў Саксоніі напярэдадні франкскага заваявання

Саксонія ўяўляла сабой адну з пяці буйных германскіх племянных абласцей поруч з Алеманіяй, Баварыяй, Цюрынгіяй і Фрызіяй. Яна апошняй з германскіх племянных тэрыторый увайшла ў склад Франкскай дзяржавы і ўключылася ў працэс феадалізацыі, які меў тут свае рысы і суправаджаўся бязлітаснай барацьбой. Многія асаблівасці гістарычнага шляху Саксоніі ў феадальную сярэдневяковую заходнееўрапейскую цывілізацыю караніліся ў спецыфіцы яе сацыяльна-палітычных адносін напярэдадні франкскага заваявання.

У VIII ст. грамадскія адносіны ў саксаў выглядалі некалькі інакш, чым, напрыклад, у баварцаў ці алеманаў [1]. Існуюць дзве пісьмовыя крыніцы, якія пераважаюць над іншымі ў сэнсе разгляду палітычнай арганізацыі гэтага племяннога саюза, відаў і спосабаў рэгулявання грамадскіх адносін, пытанняў вайны і міру, законаў і права. Першая — «Царкоўная гісторыя англасаксаў» («Historia ecclesiastica gentis Anglorum») Беды Высокашаноўнага (Beda Venerabilis) [2], які жыў у 670–735 гадах. Ён быў англасаксонскім свяшчэннікам, яго творы ў перыяд ранняга сярэднявечча шырока распаўсюджваліся не толькі ў Англіі, але і на Кантынеце. Другая крыніца — «Vita Lebuini» ўяўляе сабой жыццеапісанне Лебуіна, англасаксонскага місіянера, які яшчэ да пачатку саксонскай вайны Карла Вялікага спрабаваў распаўсюдзіць у саксаў хрысціянства [3, с. 795-798]. На падставе звестак названых крыніц можна зрабіць вывад, што ў саксаў у пачатку VIII ст. яшчэ не было караля, і, акрамя таго, саксонскі племянны саюз у цэлым не меў адзінага герцага. Толькі ў перыяд вайны ён вызначаўся жэрабам. Тэрыторыя, што засялялася саксамі, была падзелена на шматлікія вобласці (Gauen) [4, с. 254], на чале якіх стаялі Gan — кіраўнікі, якіх Беда называе satrapae [2]. Аб тым, кім прызначаліся satrapae, ні Беда ні аўтар Vita Lebuini не называюць. Але можна меркаваць, што гаворка ідзе аб народных сходах так званых саксонскіх правінцый, гэта значыць саксонскіх племянных абласцях. Такіх частак было чатыры, якія разам стваралі саксонскі племянны саюз. Паміж Рэйнам і Везерам жылі вестфалы, у сярэднім цячэнні Везера пасяляліся англы, між Везерам і Эльбай — остфалы, а на поўнач ад вусця Эльбы — норд-альбінгі.

Такім чынам, у саксаў не было адзінага спадчыннага герцагства, як, напрыклад, у бавараў і алеманаў, дзе была б сканцэнтравана значная ўлада. Не было і элементаў дзяржаўна-адміністрацыйнай арганізацыі ў выглядзе графстваў, як гэта здарылася ў паўднёвых абласцях. Хрысціянская царква яшчэ не валодала ў той перыяд вартым упамінання ўплывам, адсутнічала ўсякая падабенства царкоўнай арганізацыі, не было епіскапстваў і кляштараў. Нішто, аднак, так пераканаўча не даказвае своеасаблівасць саксонскіх грамадскіх адносін, як той факт, што рашэнні, якія датычацца ўсяго племяннога саюза, прымаліся сходамі, у якіх удзельнічалі ўсе сацыяльныя слаі, за выключэннем несвабодных. Адзін раз у год збіраўся гэты сход «у цэнтры Саксоніі каля ракі Везер у месцы, якое называлася Маркло (Marklo).» Ад кожнага Gau поруч з Gau-кіраўнікамі, satrapae, удзельнічалі таксама 12 прадстаўнікоў знаці, свабодных і паўсвабодных. На сходах аднаўлялі законы, вырашалі важнейшыя судова-прававыя і палітычныя (аб вайне і міру) пытанні [3, с. 793].

Своеасаблівасць палітычнай арганізацыі ў саксаў (парадак ваеннай дэмакратыі) абумоўлівалася спецыфікай сацыльна-эканамічнага становішча. Да пачатку войнаў у Саксоніі не былі выкаранены ўласцівыя радавому грамадству адносіны. Працэсы феадалізацыі ў Саксоніі развіваліся больш павольна, таму што тут значна пазней, чым у Баварыі, Алеманіі, Цюрынгіі, сфарміравалася буйное землеўладанне герцагскіх сем'яў і царквы, гэта значыць, тыя інстытуты, у якіх мацней за ўсё праяўляўся франкскі ўплыў і феадальныя элементы [5]. Аднак разлажэнне радавых сувязяў, ваенныя падзеі, у ходзе якіх саксы на працягу доўгага часу рухаліся з поўначы на поўдзень, прывялі да ўзнікнення і паскарэння працэсу сацыяльнай дыферэнцыяцыі. Па сваіх знешніх праяўленнях ён быў падобны на той, які існаваў ў канцы VII ст. у алеманаў і бавараў. У саксаў у пачатку VIII ст. адбываўся працэс паступовага ўтварэння алода і развівалася сацыяльнае расслаенне. Утварэнне алода спрыяла ўзнікненню якасна іншых умоў для разгортвання дыферэнцыяцыі [4, с. 256-257], яе паскарэння і вылучэння сацыяльных груп. Хаця ўвогуле ў Саксоніі гэтыя працэсы праходзілі больш марудна, чым у іншых народаў Германіі, напрыклад, у алеманаў, бавараў і нават цюрынгаў, што было звязана з існаваннем традыцыйных форм уласнасці і карыстання зямлёй, парадкам радавога характару ў грамадстве, якому і адпавядалі гэтыя формы ўласнасці і землекарыстання. Таму магчымасць сацыяльнай дыферэнцыяцыі з пачатку VIII ст. мела тут больш вузкія межы, чым, напрыклад, у Баварыі ці Алеманіі. Зазначым, што дыферэнцыяцыя ў саксаў адрознівалася своеасаблівай архаічнасцю.

У саксонскай сацыяльнай структуры выразна выступае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

юрыдычна ўзаконенае асабістае становішча слоя саксонскай знаці, nobiles, якое перавышала ў VIII ст. сваім багаццем і ўплывам іншыя слаі [4, с. 258-259]. Існуючыя прававыя нормы забяспечвалі яе асабістае становішча. Напрыклад, забараняліся шлюбы паміж знаццю і простымі свабоднымі саксамі, парушэнне чаго каралася смерцю [6]. Жыццё nobiles, акрамя таго, ацэньвалася буйным грашовым вергельдам, што ў шэсць разоў перавышаў вергельд свабоднага сакса-фрылінга і гарантаваў знаці асабістую абарону, паракануўча падкрэсліваў сацыяльнае першынство. Адрозненні ў прававым становішчы асобых груповак былі прамым вынікам узнікшай сацыяльнай дыферэнцыяцыі. І ўсё ж, у той перыяд амаль немагчыма было строга размежаваць Саксонію на чатыры сацыяльныя групы: знаць (nobiles), свабодных (фрылінгі), паўсвабодных (літы) і несвабодных (рабы, батракі). Ва ўсякім выпадку, для грамадства характэрна значная сацыяльная дыстанцыя, якая аддзяляла адзін ад другога свабодных і паўсвабодных, літаў. У прававых адносінах гэтыя сярэднія слаі грамадства былі прыкметна блізкія. Знаці яшчэ не ўдалося рашуча паменшыць значэнне народных сходаў Маркло, у якіх удзельнічалі як фрылінгі, так і літы, меўшыя права насіць зброю. Для літаў, як і для свабодных, вялікае значэнне мелі кроўна-родныя сувязі, што забяспечвалі літу ў пэўнай ступені бестурботнае жыццё і ахову, якую не мелі, напрыклад, рабы. Літ быў правздольны. Ён абавязваўся ўдзельнічаць у судовых пасяджэннях і несці там за сябе асабістую адказнасць, мог адхіліць праз прысягу выстаўленыя супраць яго неабгрунтаваныя абвінавачанні. Літ меў права, як зазначалася, насіць зброю, што падкрэслівала яго ўдзел у ваеннай арганізацыі племяннога саюза. Менавіта таму саксонскі літ мог быць успрыняты як свабодны, толькі з абмежаванымі правамі, што стала рэальнасцю дзякуючы яго ўдзелу ў палітычным жыцці племяннога саюза і яго правздольнасці. Таксама, як і знаць, і свабодныя ён удзельнічаў у племянных сходах Маркло. У час саксонскай вайны перад Карлам Вялікім з'явіліся не толькі свабодныя, але і літы ў знак пакарэння [7].

У апошняй чвэрці VIII ст., калі ўзніклі першыя саксонскія законы і прававыя запісы, сацыяльнае існаванне паўсвабодных грунтавалася на пэўнай ступені іх гаспадарчай самастойнасці. У прыватнасці, літы абавязваліся ў мэтах забеспячэння цэркваў, што будаваліся, «дзесятую частку сваёй маёмасці і даходаў дарыць царкве і духавенству» і «так сваю частку Богу вяртаць» [8]. Літы абкладаліся і грашовымі штрафамі. Яны выконвалі адносна царквы фактычна тыя ж павіннасці, што і свабодныя пасля франкскага заваявання. Усе гэтыя прадпісанні былі звязаны са здольнасцю літаў набываць маёмасць і магчымасцю распараджацца ёй. Аднак, нягледзячы на гэтыя перавагі, літы былі паўсвабоднымі, а

гэта азначала, што яны знаходзіліся ў залежнасці ад свайго гаспадара. Гэта было праяўленнем няпоўнай праваздольнасці літаў, што цягнула за сабой у пэўных выпадках распараджэнне літамі як рэчамі. Ён страчваў абарону свайго спадара, калі без яго ведама забіваў чалавека. У гэтым выпадку сваякі забітага мелі права самого літа і сем яго кроўных родзічаў узяць на правах уласнасці [9]. Ніжэй літаў у сацыяльным плане знаходзіўся і ад іх выразна адрозніваўся сваёй бяспраўнасцю слой наёмных вытворцаў, серваў або батракоў. Яны не былі прадстаўлены на племянных сходах Маркло і не валодалі ніякай праваздольнасцю [10]. У VIII ст. стварыліся ўмовы для пашырэння несвабодных слаёў насельніцтва ў Саксоніі. Знаць, верагодна, паступова адыходзіла ад уласнай вытворчасці і пачынала весці спосаб жыцця землеўладальнікаў, які дапускаў эксплуатацыю залежных вытворцаў. Падкрэслім, што зямельныя ўладанні і колькасць залежных людзей моцна адрозніваліся па памерах і па колькасці. Значны ўплыў аказвалі дафеадальныя формы эксплуатацыі ў выглядзе патрыярхальнага рабства і батрацтва. Сядзіба, раскапаная ў Варэндорфе, дае ўяўленне аб гаспадарчай арганізацыі саксаў, для якой значэнне набывала выкарыстанне працы залежных вытворцаў. Да сядзібы далучаўся жылы дом даўжынёй да 30 м, вакол якога размяшчаліся канюшня, невялікі свіран і памяшканне для сена, а таксама невялікія зямельныя дзялянкі, якія, як правіла, складаліся з невялікага жылога дома, канюшні і свірана. Яны, пэўна, могуць разглядацца як жыллё залежных людзей [11].

Такім чынам, свабодныя, палітычна паўнапраўныя фрылінгі і паўсвабодныя літы складалі пераважную частку насельніцтва Саксоніі і к пачатку саксонскай вайны ў сваёй большасці былі сялянскімі вытворцамі з самастойнай гаспадаркай. Менавіта гэты статус у значнай ступені забяспечваў іх агульнае палітыка-прававое становішча яшчэ ў рода-племянным грамадстве. З гэтых сацыяльна-эканамічных і палітычных адносін вынікалі многія асаблівасці як працэсу феадалізацыі ўвогуле, так і ходу саксонскай вайны. Адносна з'яднаны і шырокі слой сялянскіх вытворцаў аказаў значны ўплыў на грамадскае і палітычнае жыццё Саксоніі.

РЕПАЗІТОРЫЙ БДПУ

## ЛІТАРАТУРА


1. *Неусыхин А. И.* Возникновение зависимого крестьянства как класса раннефеодального общества в Западной Европе в 6-8 вв. М., 1956. С. 161-187.
2. *Beda Venerabilis*. Historia ecclesiastika gentis Anglorum //Pl. T. 90. Parisiis, 1862.
3. *Vita Lebuini* // MGH. SS. Bd. 30, 2. Leipzig, 1934.
4. Deutsche Geschichte. Bd. 1. Von der Anfangen bis zur Ausbildung des Feudalismus Mitte des 11. Jahr fruhes.

Berlin, 1982.
5. Geschichte Thuringes. Hrsg.v.Hans. Patze und Walter Schlesinger. Bd.1 Grundlagen und fruhes Mittelalter. Koln-Granz, 1968. S. 372-374.
6. *Lintzel M.* Die Unterwerfung Sachsens durch Karl der Grosen und der sachsische Adel. Untersuchengen zur Geschichte der alten Sachsen, X // Lintzel M. Ausgewahlte Schriften. Bd.1. Berlin, 1961. S.101-104.
7. Capitulatio de partibus Saxoniae (775-790), 17 // MHG. Legum sectio II. Capitularia regum Francorum, 26, 17 Bd. 1. Hannover, 1883. S. 69.
8. Lex Saxonum, 18 // Leges Saxonum und Lex Thuringorum. Hannover, 1918.
9. Lex Saxonum, 18; Capitulatio de partibus Saxoniae, 15, 17, 19, 20, 21.
10. Annales regni Frankorum, a.806 // Quellen zur karolingischen Reichsgeschichte. 1. Teil. Berlin o.J. S. 82.
11. *Winkelman W.* Eine westfalische Siedlung des 8. Jahrhunderts bei Warendorf. Kr. Jg. 32, 1954. S. 189-213.

*SUMMARY*

*The peculiarities of social-political relations in Sax on the eve of French Conguest in the century vitality of tribe structures of Saxon society, stipulated specific history of integration in the medieval west-europan civilization.*

УДК 956.93

*В. У. Адзярыха*

# РАЗВІЦЦЁ ПАЛІТЫЧНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ ШЫІЦКАЙ АБШЧЫНЫ ЛІВАНА Ў 60-70-Я ГАДЫ XX СТ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Значнай з'явай у жыцці сучасных краін Азіі і Афрыкі стаў працэс капіталістычнай мадэрнізацыі ўсіх сфер эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця. У выніку гэтага пачалі актыўна фарміравацца структуры грамадзянскага грамадства – грамадства без саслоўных, кланавых і карпаратыўных перагародак.

Адначасова з гэтым працэсам адбываецца ўнутраная кансалідацыя шэрага этнічных і рэлігійных груп, якая суправаджаецца ростам іх палітычнай актыўнасці. Галоўным чынам гэта датычыцца груп, якія ў мінулым займалі найбольш нізкія ступені сацыяльнай іерархіі. На сучасным этапе ў выніку разбурэння традыцыйнага патрыярхальнага ўкладу ўнутры гэтых груп павышаецца ўзровень самасвядомасці,